**22.** Як называецца загадка, у якой толькі гаворыцца пра зашыфраванае слова і неабходна ўставіць або выкінуць указаную літару ці склад, каб прачытаць адгадку?
**А)** шарада. **Б)** лагагрыф. **В)** метаграма. **Г)** анаграма. **Д)** красворд.

**23.** У якіх словах на месцы пропуску патрэбна напісаць літару ***э***:
*1) пад..шва; 2) ш..рань; 3) р..цэпт; 4) р..марка; 5) р..партаж.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 1.
**В)** ва ўсіх словах, акрамя 3. **Г)** 1, 2, 3, 5. **Д)** 2, 3, 4.

**24.** Вызначце гады жыцця выдатнага беларускага асветніка і гуманіста Францыска Скарыны.
**А)** каля 1480 – 1533 гг. **Б)** каля 1550 – пасля 1595 гг.
**В)** 1470 – каля 1545. **Г)** 1490 – каля 1551 гг. **Д)** 1461 – 1506 гг.

**25.** Вызначце словы, у якіх выдзеленыя літары абазначаюць правільныя націскныя галосныя: *1) стар**ы**; 2) сп**і**на; 3) **а**ркуш; 4) дак**у**мент; 5) г**а**нак.*
**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 4.
**В)** няма правільных варыянтаў. **Г)** 1, 3, 5. **Д)** 2, 4.

**26.** У якіх словах з прыведзеных замест кропак патрэбна ўставіць літару ***в***:
*1) ас..альт; 2) біск..іт; 3) крас..орд; 4) ш..ейцар.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 1. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**27.** Вызначце правільна напісаную назву выключна рэдкай, каштоўнай рэчы.
**А)** рарытэт. **Б)** рэрытэт. **В)** рырытэт. **Г)** рырэтэт. **Д)** раратэт.

28. Якому слову ў сучаснай мове адпавядае старажытнае агульнаславянскае словазлучэнне *“сего лета”*?
**А)** сёння. **Б)** сёлета. **В)** сягоння. **Г)** леташні. **Д)** летам.

**29.** Як называецца паэтычны прыём, заснаваны на паўторы аднолькавых галосных гукаў у вершаваных радках?
**А)** асіміляцыя. **Б)** гукаперайманне. **В)** асананс.
**Г)** алегорыя. **Д)** алітэрацыя.

**30.** Вучань расказаў пра літаратурны тэрмін, які паходзіць ад грэчаскіх слоў *chronos* – час і *topos* – месца і абазначае ўзаемасувязь часавых і прасторавых характарыстык з’яў, паказаных у мастацкім творы. Пра які літаратурны тэрмін ішла гаворка?
**А)** хроніка. **Б)** храналогія. **В)** тэксталогія. **Г)** хранатоп. **Д)** кампазіцыя.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 10. Тыраж 36500 экз. г. Мінск. 2010 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2010»

*Чацвер, 18 лютага 2010 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Якія літары неабходна ўставіць на месцы пропускаў у словах вершаваных радкоў М. Пазнякова:

*Хоць на вуліцы мароз. Цёпла сэрцам і рукам –*
*Шум в..сёлы ля б..роз. Лепім мы сн..гавіка.*

**А)** е, я, е. **Б)** я, я, е. **В)** я, я, я. **Г)** е, е, е. **Д)** я, е, е.

**2.** Пераблыталіся літары ў словах. Расстаўце літары ў правільным парадку і вызначце назвы мэблі:
*1) а, е, р, а, с, д; 2) ф, а, ш, а; 3) р, ч, е, в, а, ц; 4) а, н, к, а, п, а.*
**А)** няма такіх назваў. **Б)** усе словы. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**3.** Як перакладаецца на беларускую мову рускае слова ***скворец***?
**А)** верабей. **Б)** бусел. **В)** грак. **Г)** шпак. **Д)** жаваранак.

**4.** Падбярыце з прыведзеных слоў сінонім да назоўніка ***кемлівасць***:
*1) хцівасць; 2) здагадлівасць; 3) карыслівасць;*
*4) абыякавасць; 5) бескарыслівасць.*
**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**5.** З дадзеных твораў выберыце толькі назвы народных казак:
*1) “Нарач”; 2) “Залаты птах”; 3) “Нямоглы бацька”;*
*4) “Разумная дачка”; 5) “Лебядзіны скіт”; 6) “Як сінячок да сонца лятаў”.*
**А)** усе назвы народных казак. **Б)** няма назваў народных казак.
**В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 4, 5.

**6.** Колькі санорных гукаў у словах сказа: *Прыгожы наш край у розныя поры года.*
**А)** няма санорных гукаў. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 10.

**7.** У народзе здаўна гавораць: *“Яснае неба зімою – перад ...”*
**А)** адлігаю. **Б)** мокрым снегам. **В)** моцнымі халадамі.
**Г)** пацяпленнем. **Д)** дажджом.

**8.** Якія выдзеленыя словы ў прыведзеных словазлучэннях ужыты ў пераносным значэнні:
*1)* ***аддаць*** *кнігу; 2)* ***дзюбы*** *кранаў; 3)* ***рэзаць*** *алмазам;*
*4)* ***лёгкая*** *дарога; 5)* ***новы*** *гадзіннік.*
**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**9.** Разгадайце рэбусы і вызначце, пад якім нумарам знаходзіцца назва стравы.

1) **Ш Ш**

2) 

3) **Ш Р**

4) 


5) **К Ш**

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**10.** Колькі імён хлопчыкаў схавалася ў слове ***Яніна***?
**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**11.** Дадзена першая частка прыказак: *1) Хто чужога не шкадуе, ...; 2) Кінеш перад сабою, ...; 3) У людзей пытай, ...; 4) Як гукнеш, ... .*
Падбярыце з дадзеных правільную другую частку: *5) так і адзавецца; 6) ды свой розум май; 7) знойдзеш за сабою; 8) той свайго не мае.*
**А)** 1 – 5; 2 – 7; 3 – 6; 4 – 8. **Б)** 1 – 8; 2 – 5; 3 – 6; 4 – 7.
**В)** 1 – 8; 2 – 7; 3 – 6; 4 – 5. **Г)** 1 – 6; 2 – 8; 3 – 7; 4 – 5.
**Д)** 1 – 6; 2 – 5; 3 – 8; 4 – 7.

**12.** Хто з беларускіх паэтаў з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў:
*Мова! Як сонца маё беларускае,*
*Ты свецішся словам кожным...*
**А)** Пятрусь Броўка. **Б)** Уладзімір Караткевіч.
**В)** Яўгенія Янішчыц. **Г)** Анатоль Грачанікаў.
**Д)** Яўген Крупенька.

**13.** Вызначце род назоўнікаў *гарэза, задзіра, румза.*
**А)** род не вызначаецца. **Б)** жаночы род. **В)** мужчынскі род.
**Г)** ніякі род. **Д)** агульны род.

**14.** Колькі дзеясловаў ужыта ў вершы П. Сушко “Сярожкавы сябры”:
*Па садочку заінелым,*
*Па сняжку пушыстым, белым*
*Паміж вішанькаў Сярожка*
*Пратаптаў сваю дарожку.*
*Важны ў хлопчыка занятак –*
*Падсыпаць штодня зярнятак*
*У птушыныя кармушкі.*
*Дружаць з ім за гэта птушкі.*
**А)** няма дзеясловаў. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**15.** У творы У. Дубоўкі “Хто дужэйшы?” ёсць радок: *Мароз навёў масты без ..., ... і без ... .* Выберыце з дадзеных прапушчаныя назоўнікі і пастаўце на патрэбныя месцы: *1) сякеры; 2) абцугоў; 3) рубанка; 4) цвікоў; 5) малатка.*
**А)** 1, 3, 4. **Б)** 2, 5, 3. **В)** 3, 4, 2. **Г)** 4, 1, 5. **Д)** 5, 4, 1.

**16.** Якія назоўнікі з дадзеных у форме роднага склону маюць канчатак ***-у***:
*1) смак; 2) тавар; 3) страх; 4) палын; 5) цукар.*
**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 5. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**17.** Колькі назоўнікаў у форме назоўнага склону адзіночнага ліку, якія маюць у сваім складзе пяць літар, можна прачытаць у квадраце па гарызанталі і вертыкалі?

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| з | а | к | а | з |
| а | л | і | с | а |
| м | а | р | а | к |
| о | п | е | р | а |
| к | а | р | а | л |

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**18.** Якія граматычныя формы мае прыметнік? Выберыце патрэбныя варыянты: *1) род; 2) склон; 3) скланенне; 4) лік; 5) час.*
**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 5.
**В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**19.** Якія з дадзеных назваў адносяцца да твораў фальклору:
*1) павер’і; 2) загадкі; 3) легенды; 4) міфы; 5) казкі.*
**А)** усе назвы. **Б)** усе назвы, акрамя 4. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4, 5.

**20.** У выглядзе чаго існавалі старажытныя папірусныя кнігі?
**А)** у выглядзе сшыткаў. **Б)** у выглядзе брашур.
**В)** у выглядзе скруткаў. **Г)** у выглядзе малюнкаў.
**Д)** у выглядзе блакнотаў.

**21.** Які назоўнік з прыведзеных мае значэнне *‘лясны вартаўнік; работнік ляснной аховы’: 1) ляснічы; 2) лясун; 3) ляснік; 4) лясіна.*
**А)** няма такога назоўніка. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.